Источник: **«Звязда»** - **2012-07-12**

# Рост экспарту не шкодзіць насычэнню ўнутранага рынку

**Станоўчае сальда знешняга гандлю краіны склала звыш 3 млрд долараў за 5 месяцаў 2012 года. Пра гэта на брыфінгу паведаміла Вольга СЯМАШКА, начальнік аналітычнага цэнтра Навукова-даследчага інстытута эканомікі Міністэрства эканомікі. Прычым сальда знешняга гандлю краіны павялічылася як за кошт знешнегандлёвых аперацый па таварах, так і за кошт аперацый па паслугах: па таварах сальда склала плюс 1,7 млрд долараў, па паслугах — плюс 1,3 млрд долараў.**

— Эканоміка нашай краіны з'яўляецца адкрытай, суадносіны экспарту і ВУП складаюць звыш 60%, таму ад збалансаванасці знешняга гандлю залежаць шмат якія макраэканамічныя паказчыкі. Была пастаўлена задача выйсці ў гэтым годзе на станоўчае сальда ў памеры не менш за 1,5 млрд долараў. Дасягнуць гэтага магчыма шляхам аптымізацыі імпарту і нарошчвання экспарту.

Па словах Вольгі Сямашкі, працягваецца ўстойлівая тэндэнцыя перавышэння тэмпаў росту экспарту над тэмпамі росту імпарту.

Яна адзначыла, што экспарт расце не толькі ў вартасным выражэнні, але і ў фізічным — штуках і тонах. Так, у 2012 годзе істотна павялічыліся фізічныя аб'ёмы паставак на экспарт грузавых аўтамабіляў, малака і малочнай прадукцыі, хімічнай прадукцыі, палімераў, этылену, сельскагаспадарчай тэхнікі і інш. Але Беларусь, як лічыць Вольга Сямашка, паспяхова карыстаецца і кан'юнктурай на сусветных рынках: больш чым на 20% зафіксавана павышэнне сярэдніх экспартных цэн на сядзельныя цягачы, шыны і калійныя ўгнаенні.

**Марына МАРКУСЕНКА, загадчык сектара грашова-крэдытнага рэгулявання Інстытута эканомікі НАН Беларусі,** расказала, што ў 2012 годзе пазітыўна развіваецца экспарт нафтапрадуктаў, растваральнікаў і разбаўляльнікаў, змазачных масел, грузавых аўтамабіляў, трактароў. А вось што тычыцца калійных угнаенняў, то фізічныя аб'ёмы іх паставак і выручка скараціліся. Наогул, па словах Марыны Маркусенкі, захоўваецца вельмі высокая таварная канцэнтрацыя беларускага экспарту — 59% ад агульнага аб'ёму экспарту краіны прыходзіцца на 6 ключавых пазіцый. Так, напрыклад, у структуры экспарту за 2012 год удзельная вага нафтапрадуктаў складае каля 33,6%, растваральнікаў і разбаўляльнікаў — 10,4%, змазачных матэрыялаў — каля 4%. Цікава, што ў геаграфічнай структуры экспарту перавышае ўдзельная вага краін ЕС над удзельнай вагой краін Мытнага саюза: у краіны Мытнага саюза доля экспарту склала 31,9%, у краіны ЕС — 47,1%. А вось што тычыцца імпарту, то яго доля з краін Мытнага саюза складае 65,1%, а з краін ЕС — 17,1%.

Вольга Сямашка падкрэсліла, што істотны рост экспарту не адбіваецца на ўнутраным рынку краіны: апошні забяспечаны ўсімі неабходнымі таварамі ў поўным аб'ёме. Яна лічыць, што "далейшае нарошчванне экспарту дазволіць рэалізаваць планы эканамічнага развіцця краіны, забяспечыць збалансаваны рост эканомікі і павялічыць дабрабыт беларускага народа".

**Павел БЕРАСНЕЎ.**